Каб помнілі

Праект рэалізоўваецца ў рамках Года народнага адзінства

# ГІСТОРЫЯ З ПАСАЖЫРАМІ

## У зале чакання вакзала станцыі Брэст-Цэнтральны працуе інтэрактыўная выстаўка «Гістарычны багаж»


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**Што звычайна робяць пасажыры ў зале чакання на вакзале? Яшчэ гадоў пятнаццаць-дваццаць таму сярод варыянтаў адказу ў ліку першых было б слова «сумуюць». Бо і сапраўды, калі трэба некалькі гадзін чакаць свайго цягніка, то час ідзе асабліва марудна. А вось цяпер адказы на пастаўленае пытанне выглядаюць амаль аднолькава: «Сядзяць у смартфонах». Ды ўсё роўна, калі чакаеш доўга, і гэты занятак можа надакучыць. Але на брэсцкім вакзале з'явілася магчымасць правесці час у зале чакання з карысцю, даведацца шмат новага пра гісторыю Брэста, будаўніцтва Брэсцкай крэпасці і яе гераічную абарону, а таксама пра абарону вакзала, пра знакавых гістарычных асоб.**

### ЧАМАДАН ІНФАРМАЦЫІ

Інтэрактыўная выстаўка зроблена ў выглядзе адкрытага чамадана, які ўтвараюць стэнды, адсюль і назва — «Гістарычны багаж». Цэнтральнае месца экспазіцыі займае інтэрактыўны дысплэй. Тут жа можна пачуць відэааповед гісторыка, краязнаўца, супрацоўніка музея пра тую ці іншую падзею, убачыць слайд-шоу з элементамі інфаграфікі, якое ў асноўным складаецца з фотаздымкаў, у тым ліку архіўных. Па ўласным жаданні можна выбраць той ці іншы раздзел і атрымаць даведку пра славутасці, музеі, помнікі, выдатных асоб.

Скажам, на экране з'явіўся партрэт. Націскаеш на подпіс і чытаеш пра Дзмітрыя Карбышава, генерал-лейтэнанта інжынерных войскаў, Героя Савецкага Саюза, які ў свой час будаваў фарты Брэсцкай крэпасці, які пасля няўдалых спроб нямецкага камандавання прымусіць супрацоўнічаць быў зверскі закатаваны ў нямецкім палоне. У цэнтры Брэста ёсць вуліца Карбышава. А вось пра асобу найбуйнейшага савецкага вучонага — ваеннага інжынера ведаюць далёка не ўсе цяперашнія школьнікі, старэйшыя юнакі і дзяўчаты. А тут, на вакзале, можна даведацца пра славутых людзей або асвяжыць, папоўніць свае веды.


Валерый ГЕРАСІМАЎ.

**Начальнік сектара ідэалогіі і сацыяльна-культурнай работы Брэсцкага аддзялення беларускай чыгункі Валерый ГЕРАСІМАЎ** гаворыць, што ініцыятыва такой выстаўкі належыць расійскаму фонду «Нацыянальная культурная спадчына»:

— Канцэпцыю распрацавалі сумесна навукоўцы Расійскай акадэміі навук і нашай Нацыянальнай акадэміі навук пры садзейнічанні Беларускай чыгункі. Так з'явіўся гісторыка-асветніцкі праект «Гістарычны багаж», мэта якога — даступна і цікава расказаць наведвальнікам пра гісторыю гарадоў і рэгіёнаў, акцэнтуючы ўвагу на асобных сюжэтах і фактах. Відома ж, галоўнай задачай праекта бачыцца выхаванне ў падрастаючага пакалення патрыятызму, любові да Радзімы. Такія інфармацыйныя пляцоўкі неўзабаве з'явяцца на вакзалах сталіцы і іншых гарадоў.

Дадзеная экспазіцыя, працягвае Валерый Уладзіміравіч, прысвечана гісторыі Брэста і Брэсцкай крэпасці, подзвігу іх абаронцаў. Значная частка матэрыялу прысвечана абароне Брэсцкага вакзала.

### ПОДЗВІГ АБАРОНЦАЎ ВАКЗАЛА

І сапраўды, калі гутарка заходзіць пра першы дзень вайны, амаль любы чалавек скажа хоць колькі слоў пра абарону Брэсцкай крэпасці. Але мала каму вядома, што літаральна за некалькі кіламетраў ад легендарнай цытадэлі ў тыя дні разгортваліся не менш трагічныя падзеі, і людзі праяўлялі такія ж мужнасць і гераізм.

Важна адзначыць, што пры ўзвядзенні вакзала і станцыі Брэст-Цэнтральны ў 80-х гадах XIX стагоддзя знарок пабудавалі сетку падземных лабірынтаў на выпадак вайны: каб захоўваць запасы харчавання і хавацца на час абстрэлаў. Гэты фактар стаў вырашальным пры абароне 1941-га года. У апошнюю мірную ноч на службе ў раёне вакзала знаходзілася каля 30 супрацоўнікаў лінейнага аддзялення міліцыі. Яны і сустрэлі ворага разам з работнікамі чыгункі, асобнымі вайскоўцамі. Бой за вакзал працягваўся чатыры гадзіны. Сілы былі няроўныя, захопнікі занялі вакзал. Абарону падземнага сховішча ўзначаліў начальнік лінейнага аддзялення міліцыі Андрэй Вараб'ёў. Немцы шмат разоў заклікалі іх скласці зброю. Абаронцы адказвалі агнём. Толькі за адну ноч вораг страціў 11 чалавек. Фашысты залівалі падвальныя памяшканні бензінам і падпальвалі, закідвалі гранатамі, запаўнялі падвалы вадой. Калі ўзровень вады дасягнуў крытычнай адзнакі, абаронцы пайшлі на прарыў. Жменьцы байцоў удалося прабіцца з пекла на волю. Андрэй Вараб'ёў загінуў пасля таго, як выбраўся з падвалаў. Пад яго кіраўніцтвам некалькі дзясяткаў байцоў у нечалавечых умовах пратрымалася дзевяць дзён.

**Начальнік вакзала станцыі Брэст-Цэнтральны Віктар КУЛАЙ** адзначыў, што праект рэалізоўваецца ў рамках Года народнага адзінства: «І тое, што да экспазіцыі праяўляюць цікавасць пасажыры, найчасцей каля экранаў-стэндаў спыняецца моладзь, гаворыць, што праект патрэбны і своечасовы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# КАЛІ ЛЕКІ СТАНОВЯЦЦА НЕБЯСПЕЧНЫЯ

### ГАЛОЎНАЕ — ПАЧАЦЬ

У адкрытых крыніцах можна знайсці нямала інфармацыі пра вынікі даследаванняў вадаёмаў, глебы, гарадскіх сетак каналізацыі. Там пастаянна выяўляюць рэшткі фармацэўтычных прэпаратаў, нярэдка вельмі небяспечных, якія маюць уласцівасць назапашвацца ў жывых арганізмах. У гэтых рэштках, напрыклад, поўна антыбіётыкаў. Туды яны трапілі з нашых аптэчак. Небяспечныя рэчывы трапляюць у ваду і глебу, спажываюцца потым жывёламі, птушкамі, раслінамі, а мы з вамі вымушаныя гэта з'ядаць з усімі наступствамі для здароўя.

Праблема даўно занепакоіла баранавіцкіх грамадскіх актывістаў. Адзін з іх — Яўген Калач — і стаў ініцыятарам кампаніі «Прырода без фармацэўтычных адходаў», якая стартавала ўвосень 2019 года. Яе ідэя — у арганізацыі збору пратэрмінаваных і непрыдатных для выкарыстання лякарстваў ад жыхароў горада і раёна ў спецыяльныя кантэйнеры, а таксама ўтылізацыя сабраных фармацэўтычных прэпаратаў. Другая задача, асветніцкая, заключалася ў шырокім інфармаванні насельніцтва па ўказанай тэме. Тады ж, у лістападзе, у Баранавіцкай цэнтральнай паліклініцы быў устаноўлены першы кантэйнер для збору непатрэбных лекаў. За ім паявіліся яшчэ тры. Пазней была зарэгістравана некамерцыйная сацыяльна-экалагічная ўстанова «Цэнтр экалагічнага і сацыяльнага развіцця», які ўзначаліла жонка Яўгена — Вікторыя.

— Мы сталі працаваць не толькі ў Баранавічах, але і ў многіх іншых гарадах краіны, — расказвае Вікторыя Калач. — Самымі складанымі і працаёмкімі аказаліся арганізацыйныя пытанні. Першыя нас, дарэчы, падтрымалі камерцыйныя аптэкі, і першыя кантэйнеры з'явіліся там. Але ў далейшым мы вырашылі рабіць стаўку на паліклінікі. І вось чаму. У аптэку чалавек заходзіць нярэдка па дарозе ў краму, забягае ў абедзенны перапынак, — адным словам, вельмі часта аптэку наведваюць амаль што выпадкова. А ў паліклініку чалавек ідзе, як правіла, з дому і мэтанакіравана. Таму ён можа прыхапіць з сабой пратэрмінаваныя лекі. Гэта зручна.

Словам, пачыналі з таго, што пісалі пісьмы кіраўнікам выканаўчай улады з просьбай размясціць кантэйнеры ва ўстановах аховы здароўя, працягвае суразмоўніца. Потым спісваліся з галоўнымі ўрачамі паліклінік, узгаднялі арганізацыйныя моманты. Гэта нярэдка займала шмат часу, але ж намаганні таго вартыя.

### ПЕРШЫЯ ЦЭНТНЕРЫ — ВА ЎТЫЛЬ

За год арганізацыя ўстанавіла 34 пункты збору пратэрмінаваных лекаў, у тым ліку 10 — у Брэсцкай вобласці, 13 — у Мінскай, 3 — у Гродзенскай. За гэты час сабрана і ўтылізавана больш за 325 кілаграмаў пратэрмінаваных лекаў. Дарэчы, з гарадоў больш за ўсё сабрана ў Барысаве — звыш 80 кілаграмаў. Названыя лекі спалілі ў Мінску на спецыялізаваным прадпрыемстве. Там прэпараты ўтылізуюцца шляхам спальвання пры тэмпературы не менш за 850 градусаў.



Гэта значыць, больш за 300 кілаграмаў небяспечных рэчываў не трапяць у сцёкавыя воды, у зямлю, не будуць забруджваць навакольнае асяроддзе. Але ж гэта ўсё роўна невялікая частка фармпрэпаратаў, якія проста выкідваюцца ў кантэйнеры з бытавымі адходамі і вывозяцца на палігоны.

Таму сваю другую задачу каманда «Цэнтра» бачыць у асветніцкай рабоце. Наладжана супрацоўніцтва з Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам. Для навуковых даследаванняў адной з лабараторый ВНУ быў выкарыстаны прыкладна цэнтнер сабраных прэпаратаў.

### ВА ЎСЕ ДЗВЕРЫ

Вікторыя Калач сказала, што работу ў паліклініцы па ўстаноўцы кантэйнераў яны пачынаюць звычайна гутаркай з медперсаналам. Урачоў, участковых медсясцёр просяць нагадваць пацыентам аб неабходнасці экалагічнага збору лекаў для іх далейшай утылізацыі. Часам чалавек, асабліва пажылы, і не зверне ўвагу на кантэйнер з подпісам «Пункт збору пратэрмінаваных лекаў», а вось параду свайго доктара ён успрыме як інструкцыю да дзеяння.

Яшчэ супрацоўнікі цэнтра ідуць у калектывы, найбольш у школьныя, і выступаюць там, расказваюць пра шкоду прыродзе ад лекавых прэпаратаў і неабходнасць цывілізаванага іх збору. Установа выпусціла чатыры коміксы тыражом па 250 экзэмпляраў і раздала іх. На Youtube-канале запусцілі дакументальны фільм «Прырода без фармацэўтычных адходаў». Свой праект сёлета прадставілі на рэспубліканскім экалагічным форуме. І там ён атрымаў станоўчыя водгукі.

— Мы стукаемся ў любыя дзверы, — разважае Вікторыя, — і даволі часта нам адчыняюць. Мы разумеем, што знаходзімся ў самым пачатку шляху па фарміраванні культуры спажывання лякарстваў, але ж усе гэтыя крокі трэба зрабіць, пажадана ўсім разам. Таму важна аб'яднаць намаганні ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

### НА ДЗЯРЖАЎНЫМ УЗРОЎНІ

Дарэчы, гэтая работа — не асобная кампанія грамадскай арганізацыі. 20 чэрвеня 2020 года ў краіне быў зацверджаны і ўведзены ў дзеянне Тэхнічны кодэкс №13/4-Т (Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі). Пункт 12.7 названага дакумента выглядае так: «Адходы пратэрмінаваных лякарстваў падлягаюць збору ў аптэках, бальніцах, паліклініках, амбулаторыях і іншых арганізацыях, якія аказваюць медыцынскія паслугі насельніцтву, шляхам устаноўкі спецыяльных кантэйнераў для самастойнага размяшчэння там адходаў фізічнымі асобамі або шляхам перадачы адходаў упаўнаважанаму работніку такіх арганізацый». Такім чынам, на дзяржаўным узроўні вызначана, што рэшткі лекаў не павінны трапляць у навакольнае асяроддзе.

Усё больш нашых грамадзян гэта разумее, падтрымлівае. Але неабходна, каб свядомых людзей было яшчэ больш, каб кожны расказваў пра кантэйнеры ў паліклініках суседу, таварышу па вучобе і рабоце. Гэта наша агульная справа, наша навакольнае асяроддзе і адпаведна — здароўе.

Напрыклад, у Баранавічах пункты збору заходзяцца ў цэнтральнай гарадской паліклініцы, у ветклініцы «Айбаліт», у медыцынскім цэнтры «Леда Мед», у інтэрнаце будтрэста № 25. У Брэсце лекі можна пакінуць у паліклініцы № 1, у жаночай кансультацыі па вуліцы Кірава, у філіялах паліклінік па мікрараёнах і іншых установах. Не так даўно пункт збору з'явіўся ў Маладзечне. Знайсці адрас найбліжэйшага пункта ў вашым горадзе можна ў сацыяльных сетках, альбо зайшоўшы на сайт «Цэнтра экалагічнага і сацыяльнага развіцця».

Там жа размешчаны парады па правільнай утылізацыі лекаў. Маецца на ўвазе, што выкідваць трэба таблеткі, капсулы, аэразолі, суспензіі, мазі, свечкі, папярэдне выняўшы іх з упакоўкі. Нельга выкідваць раслінныя прэпараты, вітаміны. Апошнія не прычыняюць урону навакольнаму асяроддзю, а іх утылізацыя каштуе немалых грошай. Важна спаліць вельмі небяспечныя прэпараты, якія могуць нашкодзіць здароўю. Напрыклад, рэшткі асобных лекавых прэпаратаў здольных выклікаць праблемы рэпрадуктыўнага характару, прывесці да ўстойлівасці да антыбіётыкаў, развіцця алергіі і іншых негатыўных наступстваў. Таму трэба ўсім нам прывучацца да правільнай утылізацыі лекавых сродкаў. Не варта набываць іх у запас. Акалі нешта не выкарысталі, трэба прынесці і пакласці ў кантэйнер.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*